Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА імя Ул. І. ЛЕНІНА

№ 17 (605) Пятніца, 21 мая 1965 г. Год выдання XVIII Цана 1 кап.

## НАШЫ ІНТЭРВ'Ю

ВЯСНА. Прыгажуняй ідзе яна па зямлі, дорыць людзям лагодную ўсмешку сонца. З новымі клопатамі, трывогамі і радасцямі прыйшла яна да студэнтаў. Студэнцкая вясна— гэта гарачая падрыхтоўка да летняй сесіі. І набліжэнне сесіі адчуваецца ў заклапочаных, уважлівых тварах студэнтаў, што запоўнілі ў гэты час чытальныя залы бібліятэк, ленпакоі, кабінеты. Дарагая кожная хвіліна як для першакурсніка, так і для пяцікурсніка, у якога вось-вось надыйдзе пара здачы дзяржаўных экзаменаў.

Аб чым жа думаюць сёння студэнты, як яны рыхтуюцца да сесіі? Наш студкор Фёдар Бандаровіч пабываў у аудыторыях, бібліятэках, пакоях нашых інтэрнатаў і ўзяў інтэрв'ю ў некаторых студэнтаў.

СТУДЭНТКУ першага курса Лену Шаркоўскую я сустрэў у бібліятэцы.

— Хвалююся,—кажа першакурсніца,—вось здала залікі па медпадрыхтоўцы і беларускай мове. А ўперадзе яшчэ сем залікаў і экзамены...

Я ўпэўнен, што Лена хоць і занадта хвалюецца, але перадолее любыя цяжкасці. Дзіва што: столькі розных падручнікаў ляжыць вакол яе на стале! Ніводнай хвіліны часу не траціць яна дарэмна.

— Першую сесію здала на «выдатна», гэтую таксама пастараюся здаць на «выдатна»,—гаворыць Лена...

КВАСЮК Яўген, студэнт хімфака, як і належыць другакурсніку, настроен больш спакойна.

— Зімовую сесію здаў на «добра» і «выдатна»,—гаворыць ён.

— А як думаеш здаць летнюю? Увага цяпер, відаць, уся сканцэнтравана на першых экзаменах—па арганічнай хіміі і крышталахіміі?—цікаўлюся я.

—Хімія даволі цяжкі прадмет; каб добра здаць сесію, патрэбна старанная падрыхтоўка. Перад экзаменамі часта збіраемся разам амаль усёй групай і паўтараем пытанні. Кожны выказвае сваю думку па той ці іншай тэме. Вядома, перад гэтым трэба самому падрыхтавацца. Такая сумесная падрыхтоўка да экзамена дае добрыя вынікі.

СТУДЭНТ трэцяга курса фізфака Нгуен Цьеў Ту прыехаў у Мінск з Дэмакратычнай Рэспублікі В'етнам. У яго таксама хутка сесія. Напісаў курсавую работу. Цяжка было Ту спачатку, бо студэнтам, якія прыбылі да нас з іншых краін, апрача асноўнага курса, трэба было вывучаць рускую мову. Але Ту адразу сур'ёзна ўзяўся за вучобу, і сесіі здае толькі на «выдатна» і «добра».

СТУДЭНТЫ! чацвертага курса аддзяленняў беларускай і рускай мовы і літаратуры філалагічнага факультэта праходзілі вытворчую практыку ў школах. Праца настаўніка вельмі падабаецца Лідзе Прашковіч. Цяпер яна, як і ўсе бьўшыя практыканты, рыхтуецца да сесіі. Займацца прыходзіцца вельмі многа, асабліва шмат перачытаць літаратуры. Акрамя падрыхтоўкі да сесіі, яна вельмі многа часу аддае грамадскай рабоце. Ліда—сакратар камсамольскай арганізацыі курса, стараста групы...

НАЙБОЛЬШ цікавая ўсё ж, напэўна, думка пяцікурсніка. Сцяпан Говін, студэнт пятага курса аддзялення журналістыкі, — адзін з лепшых студэнтаў універсітэта.

Толькі двойчы за пяць год у яго заліковай кніжцы з'яўлялася адзнака «добра», астатнія экзамены ён здаў на «выдатна».

— Як жа табе, Сцяпан, удалося дабіцца такой пасняховасці? — пацікавіўся я.

—Шлях да гэтага,—тлумачыць ён,—праца і толькі праца. Я рэгулярна наведваў кожную лекцыю, стараўся ўважліва канспектаваць. Пасля заняткаў прачытваў канспект, абдумваў кожную думку выкладчыка. Таму сесіі я ніколі не баяўся. І мне дзіўна неяк становіцца, калі іншы раз пачую ад некаторага студэнта: «Як здаць экзамен, дужа ж ён цяжкі». Мне здаецца, што гэты студэнт прагуляў семестр, а адным наскокам навуку не схопіш. Ночы, праседжаныя напярэдадні экзамена, нічога не дадуць.

У гэтыя дні, дні падрыхтоўкі да дзяржаўнага экзамена, Сцяпан Говін часта ходзіць у кіно, тэатр, чытае газеты і многа мастацкай літаратуры. Многія скардзяцца, што грамадская работа адрывае ад заняткаў, асабліва ў апошнія дні перад экзаменамі.

— Я адмаўляю такую думку,—гаворыць Сцяпан.—Спалучэнне вучобы з грамадскай работай толькі дапамагае, дапаўняе адно другое.

У заключэнне застаецца толькі дабавіць, што Говін спартсмен-разраднік, актыўна ўдзельнічае ў мастацкай самадзейнасці універсітэта, стараста групы.

Пяць студэнтаў падзяліліся сваімі думкамі аб падрыхтоўцы да летняй сесіі. Усе яны жывуць адной думкай: «Здаць сесію як мага лепш».

## ПЕРШЫЯ ПОСПЕХІ

(Жыццё партыйнай групы)

У партыйнай групе першага курса гістарычнага факультэта 22 камуністы і кандыдаты ў члены КПСС. Гэта ў асноўным былыя воіны, а зараз лепшыя сілы нашага курса. Яшчэ з самага пачатку навучальнага года яны актыўна ўключыліся ў грамадскую і спартыўную работу. Так, Шурмоўскі і Чыкалеўскі ўвайшлі ў зборную каманду па футболу, Мельнік і Бельскі выдатна выступілі па лёгкай атлетыцы, Пятроўскі — па валейболу і стральбе, Курганаў—па каньках.

Але галоўную ўвагу мы ўдзялілі вучобе, асабліва цяпер, у час падрыхтоўкі да летняй сесіі. Камуністы праявілі максімум старання, дапамагалі адзін аднаму. І гэта дало добрыя вынікі. Большасць здае экзамены на «выдатна» і «добра». Сярод іх В. Клімовіч, Е. Калеснік, С. Сальнікаў і многія іншыя.

Актыўна ўдзельнічаюць першакурснікі ў мастацкай самадзейнасці факультэта, асабліва камуністы Лескавец, Шаўцоў, Дзябёлаў і іншыя. Аб гэтым сведчыць тое, што курс заняў першае месца на агульнауніверсітэцкім аглядзе мастацкай самадзейнасці.

Але трэба адзначыць, што не ўсё на курсе ішло гладка. Былі выпадкі пропуску лекцый, некаторыя студэнты не зусім добра рыхтаваліся да семінарскіх заняткаў. Выправіць гэтыя недахопы дапамаглі партыйныя і камсамольскія сходы факультэта і групы, сатырычная газета. А нядаўна работа нашай групы слухалася на пасяджэнні партбюро факультэта. Члены партбюро тт. Савачкін, Ігнаценка, Гусакова, гаварачы аб першых поспехах групы, адзначылі і шэраг недахопаў, указалі шляхі, якімі можна выйсці з гэтых недахопаў, параілі маладым камуністам больш праяўляць энергіі і задору ва ўсіх справах курса.

І. ПЯТРОЎСКІ,
партгрупорг першага курса гістфака.

## СЕСІЯ НА ГЕАГРАФІЧНЫМ

Вясна ўсё смялей і смялей набірае свае правы, засталіся ззаду мяцеліцы, сцюжы і... навучальнае паўгоддзе. Разам з вясеннім сонцам да студэнтаў прыйшла сесія. Для адных, як заўсёды, нечакана: «Эх, яшчэ б пару нядзеляк!» А другія — сустрэлі яе спакойна і нават з некаторым нецярпеннем. Сесія, а пасля — доўгачаканае лета! Адных яно вабіць цалінай, другіх — рамантыкай далёкіх дарог, трэціх — прыгажосцю зялёных дуброў. Можна яшчэ доўга пералічваць прыгажосць лета, летніх канікул, але іх трэба заслужыць.

Сесія пачалася. Геаграфічны факультэт... Калідоры сустрэлі мяне ціхім маўчаннем, але гэта толькі першае ўражанне. Каля 55-ай аудыторыі — група студэнтаў. Ідзе дзяржаўны экзамен па замежнай мове.

— Хвалюецеся, хлопцы! — пытаюся.

— Яшчэ б, гэта наш першы экзамен, ды й па новай праграме.

У гэты час адчыніліся дзверы і да нас данеслася:

— Бурдыка!

Да дзвярэй накіраваўся той самы студэнт, які адказваў на маё пытанне.

—Ні пуха ні пяра!—Выпаліў нехта яму ўслед...

Дзяўчыну, якая выйшла з аудыторыі, цесным гуртам акружылі таварышы, пасыпаліся пытанні. А яна стаяла, шчасліва ўсміхаючыся, і, мне здаецца, не чула пытанняў. Яе можна зразумець, гэта ж дзяржаўны экзамен. Нарэшце яна пачала расказваць аб прайшоўшым экзамене.

— Якую адзнаку ты атрымала, Ларыса, — пытаюся.

— Упэўнена, што не менш, як «добра».

Адзін за другім заходзяць і выходзяць з аудыторыі студэнты. На тварах адных—усмешка, другія — нечым заклапочаны...

Экзамен закончыўся. Не здаў з групы нямецкай мовы толькі адзін — Новікаў. У групе англійскай мовы — Белая. Дрэнная адзнака для гэтай студэнткі не навінка: грамадскай працай яна не займаецца, а часу, каб падрыхтавацца да экзамена, у яе, як і заўсёды, не хапіла. І не дзіўна, што ні адной сесіі Белая не здала без «двойкі». Атрымліваецца звычайная гісторыя—тыя студэнты, якія ўдзельнічаюць у грамадскай рабоце і, здавалася б, маюць менш часу, здаюць экзамены на «выдатна» і «добра», а студэнты, якія не ўдзельнічаюць у грамадскай рабоце, атрымліваюць «двойкі» і «тройкі». Вось, напрыклад, студэнткам чацвертага курса Зіне Бацян, Валі Багдановіч, Ніле Праўда — ні спорт, ні мастацкая самадзейнасць, ні другія грамадскія нагрузкі не перашкаджаюць добра вучыцца.

Брыгаду «двоечнікаў» узглаўляе на геафаку Ігар Ляскоўскі. У мінуўшым семестры ён не здаў залік па замежнай мове, таму здаваць дзяржаўныя экзамены яму не дазволілі. Але Ігар Ляскоўскі не толькі «мастак» не здаць экзамен ці залік, ён «мастак» яшчэ і схлусіць. Так, калі ён здаваў залік па эканамічнай картаграфіі, то схлусіў выкладчыку, запэўніўшы яго, што выканаў практычныя работы. Пасля высветлілася, што Ляскоўскі ніякіх практычных работ не выконваў.

Зазвінеў званок. Калідоры напоўніліся студэнтамі і ўсюды, праходзячы каля кожнай групы, я чуў размову пра сесію. Яна пачалася...

А. ТАБАЧНІКАЎ.

## НАПЕРАДЗЕ—ЦАЛІННІКІ

*Як для каго, а для цаліннікаў сесія закончылася. Здалі апошні экзамен і журналісты-цаліннікі. Ул. Вялічка, А. Гарбачоў, Ф. Кулакоў, П. Пабока, А. Ярохін, В. Поляк і А. Слука здалі сесію на «добра» і «выдатна».*

*Цяпер іх чакае цаліна. У добры час, хлопцы!*

* * *

ДОБРА папрацавалі ў гэтым семестры пяцікурснікі хімічнага факультэта. Наведвалі лекцыі, усе старанна рыхтаваліся да семінарскіх заняткаў. І вось вынік: з 95-ці студэнтаў экзамен па навуковаму камунізму 38 здалі на «выдатна», 6 — «здавальняюча», а ўсе астатнія — на «добра».

Грунтоўныя веды паказалі на экзаменах студэнты: Ул. Болбас, В. Рагожкіна, П. Аскерка, Р. Шэдава, М. Барысюк, З. Васіленка, А. Яскавец, К. Дзесюкевіч, М. Грыгаровіч і многія іншыя.



На здымку: Цікава, а што ж наступнае здаваць?

# ВЯСНОВЫЯ ТУРБОТЫ



Усюды, дзе б мы ні былі, ці то ў бібліятэцы галоўнага корпуса, ці ў лабараторыях біялагічнага, ці ў дэканаце гуманітарнага корпуса, — чуецца размова аб надыходзячай сесіі, аб цяжкасцях і перашкодах, звязаных з ёю. Вось у калідоры галоўнага корпуса мы бачым групу студэнтаў, якія вядуць размову:

— Мне б матэматычны аналіз здаць! Нешта занадта цяжка даецца гэтая дысцыпліна, — гаворыць адзін з іх...

Міма нас таропка прайшла выкладчыца, ад якой ні на крок не адставаў высокі студэнт.

— Не, і яшчэ раз, не! Ідзіце вучыце, — кіўнула яна студэнту...

Усюды, каля дошак аб'яў, таксама — студэнты. Толькі што вывесілі расклад залікаў і экзаменаў.

Цяпер у студэнтаў, якіх вы бачыце на здымку, напэўна, будзе залік. Таропка заглядваюць яны яшчэ і яшчэ раз у канспект і накіроўваюцца ў аудыторыі...

**В. АДЗІЯН,**
фота і тэкст аўтара.

# С. П. РАГОЖЫН

Пасля доўгай і цяжкай хваробы на 63-м годзе жыцця памёр дацэнт кафедры гісторыі КПСС Сяргей Пятровіч Рагожын. Назаўсёды адышоў ад нас верны сын партыі, старэйшы выкладчык, які меў выдатны вопыт педагагічнай і выхаваўчай работы ў вышэйшых навучальных установах.

С. П. Рагожын нарадзіўся ў 1902 годзе ў горадзе Арле. Ужо ў 1915 годзе ён быў вымушан пайсці працаваць па найму спачатку памочнікам токара, а пасля з 1917 года — памочнікам слесара ў дэпо станцыі Арол.

У 1925 годзе С. П. Рагожын уступіў у члены камуністычнай партыі. На працягу ўсяго свайго жыцця ён быў адданым барацьбітом за справу партыі і народа.

З 1932 года па 1935 год С. П. Рагожын знаходзіўся на вучобе ў Маскоўскім інстытуце чырвонай прафесуры, пасля заканчэння якога працаваў на выкладчыцкай рабоце ў розных ВНУ нашай краіны. У час Вялікай Айчыннай вайны С. П. Рагожын быў прызван у рады Савецкай Арміі. У 1950 годзе па стану здароўя ён быў дэмабілізаваны з арміі і накіраваны на працу выкладчыка гісторыі КПСС у юрыдычным інстытуце. З 1954 г. па 1965 г. С. П. Рагожын працаваў выкладчыкам кафедры гісторыі КПСС БДУ імя Ул. І. Леніна.

Сяргей Пятровіч актыўна ўдзельнічаў у грамадскім жыцці універсітэта, часта выступаў з лекцыямі перад працоўнымі горада Мінска і рэспублікі.

Усе, хто працаваў разам з Сяргеем Пятровічам, ведаюць яго як прынцыповага камуніста, чулага чалавека і цудоўнага таварыша.

Памяць пра Сяргея Пятровіча Рагожына назаўсёды застанецца ў нашых сэрцах.

**Група таварышаў**

# ЗА ЎЗОРНЫ БЫТ!

## Пра жыццё і быт студэнтаў расказвае камендант.

**У**СЕ факультэты ў гэтым годзе значна павялічваюць набор студэнтаў на першыя курсы. Пытанне забеспячэння студэнтаў інтэрнатам будзе займаць важнае месца ў жыцці студсаветаў і прафсаюзных арганізацый і яны ўжо цяпер павінны рыхтавацца да гэтага адказнага перыяду.

Факультэцкім прафсаюзным арганізацыям неабходна праводзіць рэгулярныя праверкі ў інтэрнатах і вучэбных карпусах. Вынікі такіх праверак павінны стаць здабыткам усёй студэнцкай грамадскасці. Гэта будзе садзейнічаць павышэнню патрабавальнасці і адказнасці студэнтаў за чысціню і парадак у інтэрнатах, непрымірымасці іх да ўсяго таго дрэннага, што перашкаджае нам змагацца за паказальны быт у інтэрнаце.

Камсамольскія і прафсаюзныя арганізацыі павінны таксама больш увагі ўдзяляць культурнаму адпачынку студэнтаў. Кожны факультэт мае поўную магчымасць праводзіць яго ў інтэрнатах. Але, на вялікі жаль, гэтага пакуль што яшчэ няма. Суботнія і нядзельныя вечары праходзяць даволі сумна. Не праводзяцца ні дыспуты, ні тэматычныя вечары, няма сапраўднага камсамольскага агеньчыку ў грамадскім жыцці. Многія студэнты лічаць, што толькі танцы могуць быць сапраўдным вечарам адпачынку, а аб іншых формах адпачынку забываюць.

У нашым інтэрнаце сіламі радыёкамітэта праводзілася не адна віктарына і цікавая радыёперадача, канцэрты. Звычайна мы іх робім вечарам. Гэтыя перадачы і канцэрты добра ўспрымаюцца студэнтамі. У арганізацыі радыёперадач многа сіл і старання аддаюць студэнты-філолагі Фларызяк і Гарэлік. Работу радыёвузла трэба шырэй выкарыстоўваць для папулярызацыі ўмоў быту і жыцця студэнтаў, іх адносін да дзяржаўнай маёмасці і абсталявання.

Мне здаецца, што ў час летніх канікул, а таксама на працягу ўсёй вучобы трэба стварыць на грамадскіх асновах спецыяльныя брыгады па рамонту інвентару. Спецыялісты для гэтага ёсць сярод студэнтаў.

Р. РАБЦЭВІЧ.

# ЯК ПРАЙШОЎ СЕМІНАР?

Днямі ў нас пад кіраўніцтвам выкладчыка Міхаіла Антонавіча Цітка адбыўся семінар па гісторыі СССР. Разглядаліся пытанні аб жыцці і быце народаў Расіі, аб іх палітычных і эканамічных адносінах з другімі краінамі ў другой палове XVIII стагоддзя. Цікава і змястоўна расказала аб рэформах Пятра I у арміі студэнтка Людміла Жукава. Цікава таксама выступілі і многія іншыя студэнты.

Але нельга тут не заўважыць, што некаторыя нашы аднакурснікі не ўмеюць рыхтавацца да семінарскіх заняткаў. Вось, напрыклад, Ада Мажука павінна была расказаць аб сікулярызацыі манастырскіх земляў у другой палавіне XVIII стагоддзя. Пытанне вельмі цікавае, але Ада не змагла яго добра разгледзець. Чаму? Прычына ўся ў тым, што студэнтка абмежавалася адным толькі падручнікам, забылася пра багаты пабочны матэрыял, не звязала яго з сучаснасцю. Таму яе ўласныя разважанні былі не абгрунтаваныя, спрэчныя. Даклад студэнткі атрымаўся слабым і нецікавым. Толькі ўжо пры дапамозе Міхаіла Антонавіча і студэнтаў, якія выступілі ў спрэчках, удалося поўнасцю раскрыць гэтае пытанне. Але на гэта пайшло вельмі многа часу.

Хачу адзначыць, што Міхаіл Антонавіч заўсёды дапамагае нам дэтальна разабрацца ў кожным складаным пытанні семінара, імкнецца запаліць у студэнтаў любоў да гісторыі нашага народа. Калі ён адказвае на тое ці іншае пытанне студэнта, то нам здаецца, што сцены аўдыторыі расшыраюцца і мы ўжо бачым Сцяпана Разіна ці Івана Балотнікава, якія паляць панскія сядзібы.

Цікава ў нас праходзяць семінары і па гісторыі КПСС, якія праводзіць дацэнт Ілья Паўлавіч Кожар. Ён вельмі многа прыкладаў прыводзіць з свайго асабістага жыцця. І зусім не выпадкова, што на экзаменах па гэтых прадметах студэнты атрымліваюць толькі «добрыя» і «выдатныя» адзнакі.

**М. ВЯРШЫНІН,**
**студэнт-вячэрнік.**

# СПОРТ

# ПРА НАШЫХ ШАШЫСТАЎ

**В**ЯЛІКІХ поспехаў дабіліся шашысты нашага універсітэта ў гэтым годзе. У першынствах рэспублікі перамогу атрымала студэнтка 2 курса матэматычнага факультэта Алена Соркіна. Гэта не дзіва. Шашкі сярод дзяўчат універсітэта карыстаюцца вялікай папулярнасцю. Дзесяткі шашыстак прынялі ўдзел ва універсітэцкіх спаборніцтвах. Мацнейшыя з іх гуляюць на першынство горада. І ўсюды ім садзейнічае поспех. Так, у першынствах, якія толькі што закончыліся, 8 з 14 удзельніц былі з універсітэта. Гэтае спаборніцтва можна назваць першынством шашыстак універсітэта.

І калі да поспехаў шашыстак мы прывыклі, то перамога шашыстаў універсітэта на першынстве Цэнтральнага савета, якое адбылося ў Севастопалі, была прыемным сюрпрызам. Каб уявіць сабе поспех нашых шашыстаў, трэба дадаць, што ў фінал спаборніцтва выйшлі чатыры ленінградцы, два масквічы, два адэсіты, па аднаму прадстаўніку ад каманд Кіева, Калініна, Горкага, Кемерава і пяць прадстаўнікоў нашага універсітэта. Гэта выдатна! Упэўнены, што ў фінальных спаборніцтвах, якія адбудуцца першага верасня ў Адэсе, нашы шашысты і шашысткі выступяць яшчэ лепш, у нас будуць і чэмпіёны і чэмпіёнкі ЦС.

Шашысты універсітэта правялі некалькі таварыскіх сустрэч. Асабліва паспяхова выступілі яны ў Гродна, дзе дабіліся перамогі над зборнай горада з лікам 11,5:3,5 і зборнай педагагічнага інстытута — 12:3. Гэтай выдатнай перамогай нашы шашысты заявілі аб сабе, паказаўшы цікавую гульню.

Важнай падзеяй для нашых шашыстаў з'явілася і каманднае першынство універсітэта. У гэтым годзе ў спаборніцтве прыняло ўдзел 9 каманд факультэтаў і 2 каманды школьнікаў горада Мінска. Напружаная барацьба закончылася перамогай матэматыкаў, пакуль што нязменных чэмпіёнаў універсітэта, на другім месцы фізікі, на трэцім хімікі і толькі чацвертае месца занялі школьнікі. У асабістым заліку пераможцамі сталі: Я. Кухарчук (матфак), П. Несцяровіч (матфак), Д. Сухарукаў (СШ № 41), Б. Бліндэр (матфак), В. Пятровіч (фізфак), Д. Каган (геафак), А. Соркіна (матфак).

На вечары шашыстаў універсітэта, які нядаўна адбыўся, былі падведзены вынікі выступленняў нашых шашыстаў. Пераможцы былі ўзнагароджаны граматамі рэктарата. Было прачытана рашэнне Федэрацыі БССР па шашках аб прысваенні мацнейшым першаразраднікам універсітэта Г. Хацкевічу, Б. Бліндэру, Е. Самойлавічу, В. Федасенку, Г. Залоцьку звання кандыдата ў майстры па шашках. Старшыня федэрацыі ўручыў ім у гэты ж вечар класіфікацыйныя білеты. Я. Кухарчуку было прысвоена званне майстра спорту па шашках.

У заключэнне адбыўся турнір паміж майстрамі і кандыдатамі ў майстры. У ім удзельнічала 30 чалавек.

**Г. ДРАБУШЭВІЧ,**
**старшыня праўлення шашачнага клуба БДУ.**

* * *

**Нядаўна на гарадскім стадыёне адбылося спаборніцтва па лёгкай атлетыцы на першынство універсітэта. Чэмпіёнамі спаборніцтва сталі студэнты гістарычнага факультэта. Іх каманда набрала 10368 ачкоў. Не ўсе калектывы выступілі паспяхова. Многія ўдзельнікі навет не ўлажыліся ў нарматыў. Таму каманды паказалі далёка не аднолькавыя вынікі. Напрыклад, юрысты, якія занялі апошняе, восьмае месца, набралі ў суме толькі 1635,5 ачкоў.**

**Вось табліца першынства па універсітэту:**

| Факультэт: | Месца: |
|---|---|
| Гістарычны | 1 |
| Фізфак | 2 |
| Матфак | 3 |
| Філфак | 4 |
| Геафак | 5 |
| Хімфак | 6 |
| Біяфак | 7 |
| Юрфак | 8 |

**Ю. Агараднічэнка,**
**наш студкор.**

Рэдактар П. П. СІЛІВАНЧЫК.

АТ 00892 Адрас рэдакцыі: г. Мінск. Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, 212. Тэл. 2-07-19. Друкарня Выдавецтва «Звязда» Тыр. 2000. Зак. № 602.